Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часопісь

Цана асобнага нумару **20 гр.**

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Ліпоўка 18,
Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі:
паштовая скрынка № 19.
Прыймо інтэрэсантаў
ад 10 да 2 гадз. што-дня,
апрача сьвятаў і нядзель.
Падпіска з дастаўкай да хаты:
на 1 год—6 зл., за паўгоду—3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год I. Вільня, 30 сакавіка 1931 г. №. 7

Беларуская справа і польскае грамадзянства.

Так - званы „Społeczny Klub“ у Вільні запрасіў Дырэктара Беларускае Дзяржаўнае Сэмінарыі гр. Р. Астроўскага прачытаць 22. III. лекцыю на тэму: „Аб праграме ў справе Беларускай“.

Ніжэй падаём прабег гэтага паседжаньня, а таксама ў каротkіх словах прамову гр. Астроўскага. Цалком яе нам запісаць не ўдалося, бо гр. Р. Астроўскі без перарывы гаварыў блізу што 2 гадзіны.

З прычыны адсутнасьці старшыні Клюбу пані Яніны Кіртыклісовай астатні сход „Klubu Społecznego“ адчыніў пан пасол Падоскі, дзякуючы дырэктару Радаславу Астроўскаму за згоду прачытаць рэфэрат аб беларускай праграме і беларуска-польскіх адносінах, і запрасіўшы на старшыню сходу генэрала Жэлігоўскага.

На пачатку дырэктар Астроўскі зазначыў, што хоча аб'ектыўна высьвятліць некаторыя маманты ў польска беларускіх адносінах, аб якіх або маўчалі, або сьвядома перайначвалі, бо ўважае, што толькі праўда паможа разабрацца ўва ўсім гэтым ды знайсьці выхад з сучаснага цяжкога палажэньня.

Перад сусьветнаю вайною, узаемныя адносіны абодвух народаў былі як найлепшыя. У змаганьні з царызмам Беларуская Рэволюцыйная Грамада ішла рука ў руку з Польскай Партыяй Социялістычнай на Літве і толькі па вайне адносіны гэтыя, дзякуючы розным прычынам пачалі завастрацца. Па сусьветнай вайне на эўрапэйскую арэну выходзяць і беларусы, імкненьні якіх касуе Клемансо словамі, што за лініяй Керзона павінна быць Расея. Па заняцьцю польскімі войскамі Менску беларусы ў пэўным мамэнце гутараць нат' аб тым, каб выбраць Маршалка Пілсудскага прэзыдэнтам. У пачатку Польшча адносілася быццам прыхільна да Беларусаў і адносіны паміж палякамі і беларусамі былі задавольваючыя, толькі ў 1920 годзе адносіны гэтыя пачынаюць псавацца. Польшча не пазваляе старшыні беларускага ўраду Луцкевічу паваротy да Парыжу, выдае загад арыштоўваць тых, хто намаўляе ўступаць у беларускае войска, напастатку Урад Усходніх Земляў пачынае ліквідаваць беларускае школьніцтва. Гэтыя факты выклікалі расчараваньне і вялікае абурэньне Беларускага грамадзянства. Паміма ўсяго беларускія аптымісты да акцыі генэрала Жэлігоўскага адносяцца прыхільна і нават ў зьвязку з гэтаю акцыяй паўстала канцэпцыя ўтварэньня Заходняй Беларусі з сталіцаю ў Вільні, але гэтую канцэпцыю Варшава пахавала і прыступіла да рэалізацыі іншай канцэпцыі—Сярэдняе Літвы.

Спачатку, пакуль кіраўніком Ураду Сярэдняе Літвы быў пан Вітальд Абрамовіч, адносіны былі задавальняючыя, але пасьля—за ўрадаваньня п. Мэйштовіча пачалося нішчэньне ўсяго беларускага. Па зачыненьню сэмінарыі ў Барунах прышла чарга і на пачатковыя школы. Праўда, што ў той час у беларускіх школах ня было „выкваліфікаваных“ папольску вучыцельскіх сілаў, але-ж тое самае было і ў польскіх школах, аднак польскім школам перашкод ня ставілі. Вельмі крыўдным было ўрэшце для беларусаў адпраўка з школаў 200 беларускіх вучыцялёў на аднагадовыя курсы ў Кракаў. Іх зразумела, замянілі іншымі вучыцелямі—палякамі, а самі яны па сканчэньні курсаў былі разьмешчаны па школах на чыста польскіх землях і назад іх вярнуць урад не згаджаецца. На гэтую крыўду беларускае грамадзянства рэагуе ў часе выбараў у Сойм у 1922 годзе, стварэньнем блёку славянскіх меншасьцяў (беларусы, украінцы, расейцы), да якога прылучыліся жыды і немцы. Да Сойму 1922 г. беларусы правялі тады 12 паслоў і 2 сэнатараў.

Аднак і далей беларусы гатовы былі прыняць удзел у дзяржаўным жыцьці Польшчы. Дзякуючы галасом беларускіх паслоў прэзыдэнтам выбіраецца Нарутовіч, генэрал Сікорскі атрымлівае вотум даверу. Але з абяцанак генэрала Сікорскага ніводная ня была датрымана, што выклікала вялікае абурэньне. Ня могучы дагаварыцца з Польскім Урадам, беларусы прабуюць дагаварыцца з польскім грамадзянствам, прынамсі з тым, якое стаяла на грунце краёвасьці. У 1924 г. Тарашкевіч згаджаецца залажыць Польска-Беларускае Таварыства, але палітычныя падзеі перашкодзілі гэтаму.

Ніхто з беларусаў ня можа пагадзіцца з языковаю ўставаю прынятаю Соймам, якая зьяўляецца несправядліваю і крыўдзячай беларускае школьніцтва ды змушае беларускую люднасьць да штогодняга плебісцыту і складаньня дэклярацыяў, а стасаваньне ў школах двуязычнасьці прычыняецца да завастрэньня адносінаў. На грунце такой пастаноўкі справы пачынаюць тварыцца гурткі Беларускай Грамады, якія спачатку змагаюцца толькі фактычна за школы ў роднай мове, а не за камуністычныя ідэі. Але паступова, пад уплывам агітацыі, пачалі хіліцца на ўсход, бо Масква, хочучы прывабіць беларусаў, дала ім магчымасьць культурна - эканамічнага будаўніцтва Беларусі: адчыняюцца тысячы пачатк. белар. школ, сотні сярэдніх, Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, Сельска - Гаспадарчая Акадэмія ў Горы-Горках і г. д. Цяпер Саветы зьмянілі фронт: усе будаўнічыя Беларусі сядзяць у лёхах Д.-П-У., а сьмерць праф. Ігнатоўскага і белар. паэты Купалы выразна сьведчаць аб сучасных адносінах Саветаў да беларускага народнага руху. У 1925 і 1926 г. г. адносіны да БССР Савецкай Расеі вабілі беларусаў з Заходу і дзеля гэтага спатыкаемся з прыхільнымі настроямі грамадаўцаў да Саветаў. Працэс і судовы прыгавар над грамадаўцамі быў жорсткі: па 12 галоў катаргі. Гэта таксама не памагло зьмене настрояў.

Ад траўня 1928 г. ў адносінах польска-беларускіх пачынаецца новы этап, хаця беларусы яшчэ шмат маюць засьцярогаў да сучаснага ўраду, але аднак у сучасны мамэнт адбылася пэўная зьмена курсу Грабскіх. Вялікая шкода, што канцэпцыя звальненьня грамадаўцаў не адразу атрымала апробату Варшавы і што звальненьне гэтае не паступіла ў часе 10-х угодкаў незалежнасьці Польшчы, бо такі акт выклікаў-бы злагоджаньне і пацыфікацыю. У Вільні ацэнівалі важнасьць гэтага акту, але Варшава не зразумела і для таго звальненьне адбылося пазьней і звольненых пушчана на вуліцу, не вярнуўшы ім правоў, і гэта лектар уважае за памылку. Тыя людзі выэмігравалі і падаліся пад дырэктывы Масквы, а Тарашкевіч ізноў трапіў у вастрог.

Ацэньваючы добрыя намеры паасобных чэсных адзінак польскага грамадзянства да польска-беларускіх адносінаў, лектар уважае аднак за патрэбнае стварэньне выразнае праграмы ўзаемаадносінаў. Праграмы могуць быць дзьве: 1) эндэцкая-асыміляцыйная, або праграма негатыўнае палітыкі і 2) праграма пазытыўнай палітыкі, палягаючая на прызнаньні беларусаў, як роўнапраўных грамадзян дзяржавы, бо беларусы шукаюць заспакаеньня сваіх патрэбаў у рамках польскае дзяржаўнасьці.

Беларускія пастуляты прамоўца дзеліць на тры групы: культурна-асьветныя, гаспадарча эканамічныя і адміністрацыйныя. Найбольшай балючкай зьяўляюцца пастуляты культурна-асьветныя. Двуязычныя школы на нашых землях маюць мала пад сабою грунту, бо нацыянальныя групы не роўнамерны, дзеля гэтага двуязычная школьная ўстава збанкрутавала. Ізноў другая канцэпцыя пасла Т. Галувкі ўвядзеньне да пачатковых і сярэдніх школаў беларускае мовы зьяўляецца рацыянальнейшай, але не заспакойвае беларускіх дамаганьняў. Ўставу п. Грабскага трэба было б скасаваць і даць магчымасьць дзецям вучыцца ў іх роднай мове. Пры сучасным палажэньні ня можна нават і лятуцець аб адчыненьні ўжо з гэтага 1931 г. г. ўсіх 500 беларускіх школаў, якіх ад 6 галоў дамагаюцца беларусы, але наразе беларускае грамадзянства здаволілася-б адчыненьнем у кожным павеце на адной поўнай 7 клясовай школе і 1—3 клясовых школ там, дзе народ гэтага дамагаецца. Гэта адразу злагодзіла-б пануючы варожы настрой. Школы гэтыя можна абсадзіць 200 вучыцелямі, якія скончылі кракаўскія курсы і якія з таго часу працуюць у іншых ваяводзтвах Польшчы. З сярэдніх школаў пакуль што можна-б было задаволіцца трымя: Клецкай, Навагрудзкай і Віленскай і вучыцельскай сэмінарыяй. Толькі ўсе гімназіі павінны атрымліваць большую дапамогу ад дзяржавы, каб моладзь, якая вучыцца, ня чула сябе пакрыўджанай. Таксама добра-б было адчыніць катэдру беларускае мовы і ўнармаваць стасункі ў праваслаўнай духоўнай сэмінарыі праз наданьне ей беларускага характару.

Трэба ўрэшце даць Клецкай гімназіі дапамогу, якую дакляраваў нат' ёй сам Прэзыдэнт. Тое, што ўлада ня выканала волі Прэзыдэнта, дакладчык лічыць шкодным для Дзяржавы, бо памяншае аўторытэт галавы яе.

Трэба таксама неадкладна даць грошы на выканчэньне будынку беларускае гімназіі ў Навагрудку, будынку, пад які вугольны камень так сама залажыў сам Прэзыдэнт Польскае Дзяржавы.

З пастулятаў гаспадарча-эканамічных урад павінен заапекавацца нашым краем і даць матэрыяльную дапамогу ня толькі абшарнікам, якія і так знаходзяцца ў лепшым палажэньні, але і сялянам, прысьпяшыць камасацыю і аграрную рэформу ды зьліквідаваць асадніцтва, якое не дае пажаданых вынікаў.

Традыцыя Вялікага Княжства не памёрла і не адзін раз будзем да яе вяртацца. Пад адміністрацыйным поглядам добрыя вынікі дала-б концэнтрацыя Беларускіх Ваяводзтваў.

У жыцьці народаў бываюць мамэнты, ад якіх залежыць далейшае разьвіцьцё падзей, працэс у Менску зьяўляецца адным з такіх мамэнтаў і сужыцьцё беларусаў з палякамі ў вялікай меры залежыць ад таго, як Польшча аднясецца да гэтага мамэнту. Калі шчыра і чэсна заспакоіць слушныя патрэбы беларусаў, дык беларусы будуць лёяльнымі адносна польскай дзяржавы, „бо толькі опадлеўшы духова народ можа лізаць той бот, які яго топча—Вы-ж гэтага падчас няволі Вашай здаецца не рабілі, не вымагайце-ж цяпер гэтага ад нас“. Гэтымі словамі дакладчык скончыў сваю прамову.

Пасьля дакладу гр. Астроўскага пачалася дыскусія, якую распачаў Ваявода п. Кіртыкліс, вельмі востра выступаючы проці дакладчыка. Рад іншых прамоўцаў парушаў паасобныя пытаньні, закранутыя гр. Астроўскім. Рашучым праціўнікам усякіх уступак беларусам аказаўся, ведама-ж, абшарнік—пасол з ББ. п. Станкевіч. Вельмі прыгожа і шчыра гаварыў затое аб патрэбе споўніць слушныя дамаганьні беларусаў інж. Адольф.

Агульнае ўражэньне ад дыскусіі, наагул, мала пацяшаючае. Толькі лічаныя адзінкі спасярод польскага грамадзянства ідуць на шлях шчырых і чэсных адносінаў да Беларускага Народу. У большасьці-ж выяўляецца імкненьне нішчыць беларусаў, але—„далікатна“, бяз лішняга крыку...

27-га сакавіка гр. Астроўскі паўтарыў свой даклад на зьезьдзе паслоў урадавае партыі з чатырох Заходніх ваяводзтваў у Вільні. Галоўным опонэнтам проці яго выступіў рэдактар абшарніцкага „Слова“ пасол Мацкевіч. Яго становішча—зусім яснае: ня трэба сьпяшацца рабіць якія-колечы ўступкі беларусам пад Польшчай, а лепш пачакаць. Мо' там, на Усходзе, Масква дакана вынішчыць беларусаў, тады і тут, на Захадзе, ня будзе патрэбы лічыцца з імі...

„Лагодзіў“ цяжкое ўражаньне ад гэтага выступленьня п. Голувко. І ён быў проці таго, каб зьезд вынес нейкую рэзалюцыю адносна беларускіх дамаганьняў, ды запрапанаваў аддаць усю беларускую справу ў камісію клюбу ББ. Няхай там—„выляжыцца“, з такой „драбніцая“ няма чаго сьпяшацца...

Ад Цэнтрасаюзу.

Прэзыдыюм Галоўнае Рады Цэнтрасаюзу гэтым даводзіць да ведама беларускае грамадзянства, што складаючы „oświadczenie“ з мэтаю адчыненьня бібліятэкі-чытальні—неабходна, каб подпіс кандыдата на кіраўніка бібліятэкі быў завераны войтам гміны або натарыусам.

Адначасна прыпамінаем тым нашым бібліятэкаром, якія ўжо атрымалі ад Цэнтрасаюзу кніжкі і яшчэ не зьвярнулі паквітаваньняў, каб з гэтым пасьпяшыліся, а тым самым не тармазілі працы Цэнтрасаюзу.

Прэзыдыюм.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Ратыфікацыя парлямантам трактатаў з Нямеччынай.

Польскі парлямант ратыфікаваў (зацьвярдзіў) вельмі важныя ўмовы з Нямеччынай. Галоўная ўмова, — так-званая, ліквідацыйная, падпісаная была ў Варшаве яшчэ 31. X. 1929 г., уваходзіць у склад трактатаў апрацаваных Гаагскай Канфэрэнцыяй (1929—1930 г. г.) — дзеля ўвядзеньня ў жыцьцё „Плану Юнга“ дый наагул—„дзеля ліквідацыі пасьледзтваў вялікай вайны“.

Ліквідацыйная ўмова, ці „Варшаўскі Трактак“, ліквідуе ўсе фінансава-маемасьцёвыя споры і прэтэнсіі паміж Польшчай і Нямеччынай.

Нямеччына зракаецца ў ёй усіх сваіх прэтэнсіяў да Польшчы, заяўленых у розных міжнародавых судох, усяго на суму звыш паўміліярда залатых марак, што, зразумела, для Польшчы дый яе дзяржаўнага крэдыту зьяўляецца вялізарнай палёгкай. Але за гэта Польшча змушана была адмовіцца ад далейшай ліквідацыі нямецкай зямельнай уласнасьці ў Заходняй Польшчы (ў былым прускім заборы), ад скасаваньня ўсяго таго нямецкага асадніцтва, якое да вайны так плянова і шырака разводзіў у краі прускі ўрад — у мэтах нямеччэньня польскага Паморра і Пазнані. Польская ўлада дагэтуль здолела скасаваць толькі крыху больш палову гэтага нямецкага асадніцтва, штосьці—няпоўныя 300.000 гэктараў. Але застаўшыяся яшчэ 200.000 зьлішкам гэктараў у валаданьні 80.000 нямецкіх асаднікаў Варшаўскі дагавор закрапляе ўжо навек, дый нават на лепшых варунках, як тыя, на якіх аддаваў гэтыя „асады“ сваім калявістам прускі ўрад, ставіўшы іх праву уласнасьці розныя засьцярогі...

Дзіва што эндэкі, асабліва—з заходніх „крэсаў“, дый наагул уся польская апазыцыя ў парламанце—страшэнна пратэставалі проці зацьверджаньня гэтай „проці польскай“ умовы! Але мін. Залескі слушна заявіў, што ўмову ўсё роўна трэба зацьвярдзіць, бо ж яна зьвязана з усім гуртом гаагскіх трактатаў, якія ўжо ўвайшлі ў жыцьцё, дый якія маюць мэтай — стабілізацыю міру й парадку ў Эўропе...

А вось нямецкія міністры дый прэса выразна кажуць, што Нямеччына заплаціла такімі вялізарнымі фінансавымі ахвярамі за тое, каб у Польшчы пакінены былі гэтыя 80.000 нямецкіх асаднікаў, якія ствараюць „жывы нямецкі мост“ паміж Нямеччынай і Усх. Прусіяй, дый якія патрэбны Нямеччыне, каб яна захавала падставу — для „далейшай сваей актыўнай палітыкі на ўсходзе“, а ўчастцы—да акцыі ў напрамку нерагляду трактатовых граніцаў з Польшчай“... Як бачым, страхі ды перасьцярогі эндэкаў маюць пэўную рацыю...

Польска - радавая пагранічная канфэрэнцыя.

24. III. у Стоўбцах адбылася польска-радавая канфэрэнцыя ў справе выдачы сталых пропускаў праз граніцу тым гаспадаром, якіх зямля разрэзана граніцай. Нарада пастанавіла адчыніць граніцу для такіх гаспадароў, пачынаючы ад 1 красавіка.

Наступная нарада мае дайсьці да паразуменьня ў справе сплаву лесу па рэках Дзьвіне й Дзісьне.

Усе — справы маюць вялікае значэньне для мясцовых жыхароў-беларусаў.

Зьезд нямецкіх культурна-асьвет. арганізацыяў у Польшчы.

Новая разумная палітыка польскага ўраду—адносна да нямецкай меншасьці, — пачаць якую так добра дапамагла яму—на сваей апошняй сэсіі—Рада Нацыяў, дае ўжо яўныя рэзультаты. — У Лодзі адбыўся толькі што зьезд нямецкіх культурна-асьветных арганізацыяў у Польшчы, на які зьехаліся дэлегаты з Лодзі, Паморра, Пазнаньшчыны, Сілезіі і ўсходніх ваяводзтваў. У якасьці гасьцей прысутнічалі дэлегаты мясцовай групы ББ і прадстаўнікі дзяржаўнай адміністрацыі.

Зьезд прыняў рэзалюцыю, у якой паміж іншым выразіў поўную лаяльнасьць да Польскай Дзяржавы, пастанавіў падтрымаць польскі ўрад у яго акцыі па консалідацыі, разбудове й абароне Польшчы, якую нямецкая меншасьць шчыра лічыць сваей бацькаўшчынай. Зьезд польскіх немцаў выразіў нават пратэст проці тых замахаў на цэласьць польскай тэрыторыі, якія ўсьцяж робяць дзяржаўнікі Нямеччыны. Востра крытыкаваў зьезд нават афіцыяльных прадстаўнікоў нямецкай меншасьці ў польскім парламаньце, абураючыся на іх—за іх апазыцыйнае становішча адносна да ўраду.

Такім чынам—зьезд, як відаць, хіба-ж хутчэй „перасаліў“, як „недасаліў“ у сваей удзячнасьці польскаму ўраду...

Гаспадарчая палажэньне.

Паводле справаздачы Краёвага Гаспадарчага Банку—гаспадарчае палажэньне ў Польшчы прадстаўлялася ў лютым мес. у наступным стане.

Дзеля таго, што гэты месяц зьяўляецца пераходным ад зімняго сэзону да вясеньняга, гаспадарчае палажэньне характарызавалася нізкім станам абаротаў у прамысловай вытворчасьці, Банковыя апэрацыі паменьшыліся за выняткам доўгатэрміновых крэдытаў, якія павялічыліся.

Ашчаднасьцёвыя ўклады паказваюць далейшы ўзрост.

Цэны на спажывецкія прадукты пасьля доўгага тэрміну зьніжак пачынаюць павышацца — асабліва пшаніца, жыта, скаціна і інш.

Палажэньне паасобных галінаў промыслу было не аднолькавае і ў валокнічным промысьле зазначаецца павялічэньне прадукцыі. Бэзработоцьце ў параўнаньні з папярэднім месяцам аслабела.

Ангельскія купцы ў Лодзі.

У Лодзь прыехала ангельская дэлегацыя купцоў, якая ў гэтых днёх заключыла рад гандлёвых транзакцыяў.

У першую чаргу закуплена тавараў на 1 міліён злотых.

Ізноў узрост безрабоцьця.

Афіцыяльныя даныя сьцьвярджаюць далейшы ўзрост безрабоцьця ў Польшчы. На дзень 21 III. зарэгістравана ўжо 380 660 безработных—на 4.246 больш, як перад тыднем.

Заграніцай.

Аўстрыяцка-нямецкая „неспадзеванка“.

Якраз перад распачацьцем сэсіі „Пан-Эўрапэйскага Камітэту“ ў Парыжу, на якім яшчэ толькі мелі быць „дыскутаваны“ справы гаспадарчага дый іншага аб'яднаньня Эўропы, нямецкая палітыка „неспадзевана“ зрабіла крок, выклікаўшы ў Эўропе „рух“, якога ня было хіба-ж ад часу знамянітага „Рапальскага Трактату“ Нямеччыны з Радамі.

Урады Нямеччыны й Аўстрыі апублікавалі ўмову, паводле якой спыняецца мытная, гаспадарчая граніца паміж абодвума краямі... Далей умова кажа, што ўсе гаспадарчыя ўмовы з іншымі — трэцьцімі—дзяржавамі абедзьве злучаныя „мытным саюзам“ дзяржавы маюць заключаць у паразуменьні адна з адной. А каб абараніцца ад усялякіх закідаў, умова ветліва запрашае да супольнага мытнага аб'яднаньня й іншых суседзяў...

Здавалася-б, нічога крымінальнага ў гэтым акце нямецка-аўстрыяцкай дыплёматыі няма. Дый абодва дыплёмата—Курцыус і Шобэр, тварцы гэтага акту, сьмела пазываюцца на... Брыянаву „ідэю Пан-Эўропы, якая якраз і дараджвае гаспадарчае аб'яднаньне дзяржаваў—у мэтах барацьбы з супольным ворагам сусьветнага крызісу!...

Але-ж чамусьці якраз Брыян найбольш абураецца проці нямецкай „неспадзяванкі“, папсаваўшай яму ўсю яго музыку эўрапэйскага аб'яднаньня!?

Справа ў тым, што „мытная ўнія“ Нямеччыны з Аўстрыяй— толькі першы крок да поўнага палітычнага злучэньня абедзьвюх чыста і аднакроўна нямецкіх дзяржаваў. А гэтае злучэньне, зразумела ж, фактычна цалком зьнішчожыць Аўстрыю як асобную дзяржаву, адначасна страшэнна павялічыўшы з усіх бакоў сілу Нямеччыны. Ясна, што гэта—зусім не да смаку валадаром сучаснай Вэрсальскай Эўропы, пабудаванай якраз на аслабленьні Нямеччыны.

Таму—і ў Вэрсальскім трактаце, як і ў розных дадатковых трактатах і конвэнцыях,—выразна забаронены Аўстрыі ўсялякага роду акты, маючыя вынікам „зьмяншэньня поўні яе дзяржаўнай незалежнасьці“. Забарона якраз мела мэтай перашкодзіць выразнаму імкненьню слабой, няздольнай да самастойнага існаваньня Аўстрыі да злучэньня з Нямеччынай.

Але перашкодзіць гэтаму злучэньню, якое дыктуецца і згоднай воляй двух аднакроўных народаў і дзяржаўным інтэрэсам абедзьвюх краін, ня можа ніякая сіла ў сьвеце. Падрыхтоўка гэтай „неспадзеванкі“ йшла ня спыняючыся ўвесь час, і вось цяпер зроблены ўжо першы рашучы й адкрыты крок да канчальнай мэты.

Дзіва, што Брыян зараз-жа арганізаваў рашучы й фармальны пратэст дзяржаваў проці нямецка-аўстрыяцкай умовы, як нарушаючай пастановы Жэнэўскай конвэнцыі 1922 г. Як ведама, тады стаяўшую на краі дзяржаўнага банкруцтва Аўстрыю адратавала Ліга Нацыяў, але ўзяўшы за гэта з яе дадатковую „прысягу“, што яна ніколі ня злучыцца з Нямеччынай...

І запраўды-ж — зараз-жа — пасьля апублікаваньня ўмовы, паслы Францыі, Італіі, Чэхаславацыі й Югаславіі ў Бэрліне заявілі пратэст проці ўмовы, зьмяншаючай сувэрэнітэт Аўстрыі“. Ангельскі пасол сьпярша не далучыўся да пратэсту, але на другі дзень і ён зьявіўся да прэм'ера і

Ф. Акінчыц. Перадрук і пераклад забаронены.

На аграрныя тэмы.

(друкуецца, як дыскусыйны матэрыял).

(Працяг)

3. Камуны.

Для большай дакладнасьці ў далейшым нашым разважаньні—ня шкодзіць прывясьці на гэтым мейсцы некаторыя акрэсьленьні, якія ўсталяваліся ў савецкай тэрміналёгіі і якія датычаць сфэры рэканструкцыі на сацыялістычных падставах сельскай гаспадаркі.

Перадусім, існуець агульнае паняцьце коллектыва ці коллектыўнай гаспадаркі (калгасы).

Пад гэтым назовам трэба разумець такую коопэратыўную арганізацыю, якая аб'еднываець у адну некалькі сельскіх гаспадарак, якія працуюць у ёй супольна і супольна выкарыстоўваюць сьродкі вытворчасьці і прадукты сваёй працы.

Калгасы аб'еднываючы вытворчасьць сваіх сяброў могуць быць названы вытворчымі коопэратывамі.

Абагульненьне вытворчасьці адбываецца ў розных „калгасах“ не ў аднолькавай ступені і таму яны распадаюцца, як паказала савецкая практыка, на тры асноўныя групы:

На таварыствы па апрацоўцы зямлі, сябрыны (артэлі), камуны, а ў апошнія часы да „калгасаў“ пачалі адносіць машыновыя т-вы і машына-трактарныя станцыі.

Таварыствы па апрацоўцы зямлі зьяўляюцца [illegible] еднываюць паасобныя гаспадаркі толькі ў адносінах да апрацоўкі зямлі. Рабочая жывёла, сельска-гаспадарчыя прылады і т. п. кожнага з супольнікаў застаюцца яго прыватнаю ўласнасьцю.

Частка кожнага з супольнікаў у вытвараных прадуктах залежыць ад таго, колькі дзесяцін ягонай зямлі было пад агульнай апрацоўкай і ў якой ступені ў гэтай апрацоўцы прыймалі ўдзел яго рабочыя рукі і яго інвэнтар.

Чароднай ступеньню можна лічыць сябрыну. Тут кожны сябра ўваходзіць у яе са сваім інвэнтаром і рабочай жывёлай. Частка кожнага сябры залежыць ад колькасьці патрачаных ім рабочых дзён і ад вартасьці ягонага інвэнтара. Часта інвэнтар і гаспадарчыя забудаваньні ў сябрыне бываюць агульныя.

І ўрэшце — камуна, якая абагульняе ня толькі вытворчасьць, але і падзел. Пры гэтай форме гаспадаркі няма мейсца паасобнаму карыстаньню і распараджэньню прадуктамі, як гэта мае мейсца ў артэлях і таварыствах па супольнай апрацоўцы зямлі. Уся маемасьць камуны належыць толькі ёй і ніхто з яе сябраў ня мае ніякай уласнасьці, маючай якое небудзь больш важнае гаспадарчае значэньне.

Калгасны рух у Саветах пачаўся ад зьяўленьня самых скамплікаваных гаспадарчых форм яго—камун.

Навязываньне гэтых новых гаспадарчых формаў вялося ў Саветах без уселякага пляну; ўнутраная арганізацыя камун мела рознародны зьмест і асабісты склад іх супольнікаў быў вельмі стракаты. Ня гледзючы на апякунства ўлады гэты від гаспадарчых аб'яднаньняў не атрымаў шырокага распаўсюджаньня і спаткаў з боку карэннога сельскага насельніцтва тых мясцовасьцяў, дзе яны зьяўляліся, вельмі варожыя адносіны. Такія адносіны тлумачацца ў большасьці выпадкаў тым, што камуны захаплялі з пад самага носу сялян лепшыя зямельныя дзялянкі і мелі заўсёды канфлікты з селянствам. Апрача таго сяляне бачылі, як непрадукцыйна губяцца народныя сьродкі на падтрыманьне такіх камун, якія ў большасьці выпадкаў і арганізоўваліся толькі дзеля таго, каб заўсёды выцягваць розныя эапамогі і беззваротныя пазычкі ў той самы час, як з працоўнага селянства карныя аддзелы вымяталі з сьвірнаў усё да апошняга зерня. Вялікая большасьць камун стварылася з даўных панскіх і манастырскіх фальваркаў, якія ня былі яшчэ аканчальна разграблены і ў якіх затрымаліся гаспадарчыя будынкі і інвэнтар.

Такіх выпадкаў, калі-б арганізавалася дабравольная камуна на пустым месцы, мы зусім не назіраем. Няма нічога дзіўнага ў тым, што пабачыўшы добры панскі фальварак — знаходзіліся ахвотнікі жыць у ім і арганізаваць там камуну ў надзеі на добрыя ўмовы жыцьцё. Аднак, знаходзячыся нават і ў такіх спрыяючых умовах — „камунары“, як агульнае правіла, настолькі бязладна вялі сваю гаспадарку, што ім заўсёды патрэбна была дапамога ад дзяржавы.

Мяжой пашырэньне камун—аказалася лічба нязьнішчаных панскіх фальваркаў — а дзеля, таго што гэтая лічба была вельмі абмяжаванай, то і колькасьць камун не магла павялічывацца. Трэба таксама яшчэ мець на ўвазе і тое, што значная частка даўных панскіх двароў адразу адыйшла ў савецкі скарб, як савецкія гаспадаркі.

(Далей будзе).

БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА.

25-га сакавіка, як і кожны год, арганізаванае беларускае грамадзянства ладзіла ўрачысты абход трынаццатых угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі.

У Вільні ўсе жывыя беларускія сілы, а ў тым ліку — беларуская унівэрсытэцкая моладзь, беларусы-гадунцы з розных сярэдніх школаў і г. д., — сабраліся на ўладжанай Цэнтрасаюзам акадэміі ў салі Віленскае Беларускае Гімназіі. За прэзыдыяльным сталом паселі прадстаўнікі беларускіх культурна-нацыянальных арганізацыяў і ўстаноў. Пасьля выпаўненьня аркестрам беларускага нацыянальнага гымну „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі“, акадэмію адкрыў ад імя прэзыдыюму Цэнтрасаюзу грам. Р. Астроўскі, які адзначыў мэту ўрачыстага сабраньня і перадаў слова ініцыятару і тварцу акту 25 сакавіка 1918 году, грам. Антону Луцкевічу.

У блізу гадзіннай прамове грам. Луцкевіч зрабіў агляд беларускага нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва за ўсе мінулыя 13 гадоў. Прачытаўшы тэкст Уставае Граматы Рады Рэспублікі з 25 сакавіка 1918 году, прамоўца адзначыў, што галоўнымі пунктамі гэтага гістарычнага акту былі незалежнасьць Беларусі і—непадзельнасьць яе, абымаючы ў межах Беларускае Народнае Рэспублікі ўсе землі, на якіх беларусы маюць лічэбную перавагу (Віленшчына, Горадзеншчына, Меншчына, Віцебшчына, Магілеўшчына, Смаленшчына, Чарнігаўшчына). Але варункі, у якіх адбылося абвяшчэньне незалежнасьці, не далі беларускаму народу зьдзейсьніць свой нацыянальны ідэал. Усё ж такі часткова зьдзейсьненьне яго пачалося: 1 студня 1919 году савецкая ўлада была прымушана пайсьці на ўступку беларусам, і ў Менску была абвешчана Савецкая Беларусь у фэдэрацыйнай сувязі з Савецкай Расеяй,—тая самая БССР, якую цяпер Чырвоная Масква гэтак жорстка прыдушыла. Рабіліся і другія спробы беларускага дзяржаўнага будаўніцтва (Слуцкае паўстаньне і інш.), але яны пасьпеху ня мелі: беларускія народныя масы яшчэ былі не даволі сьвядомыя, каб дружным высілкам адваяваць незалежнасьць. За тое цяпер, пасьля ўсіх перажытых мук і расчараваньняў, беларускія масы ўсё больш і больш пераконываюцца, што адзін толькі незалежніцкі ідэал можа забясьпечыць Беларусі праўдзівую волю. І незалежнасьць мусіць быць зьдзейсьнена, як гістарычная канечнасьць.

Не адны беларусы вераць у зьдзейсьненьне дзяржаўнага ідэалу беларускага народу: чужыя народы, так сама веручы ў гэта, карыстаюцца з нашае сучаснае расьцярушанасьці і вядуць з тымі ці іншымі беларускімі групамі і групкамі ганебны торг, „купляючы“ за грошы ці за пасольскія мандаты, даваныя здраднікам незалежніцкае ідэі, такія ад векоў беларускія гарады, як Вільня, Горадня, Берасьце, Пінск. А вось у Рызе паўстала нейкая палітычная арганізацыя, якая праектуе ўтварэньне Балтыцкае дзяржавы, у якую ўвайшлі бы Літва, Латвія, Эстонія, незалежныя гаспадарствы, і—залежная сягоньня ад чужынцаў ды падзеленая на кускі Беларусь.

Словамі глыбокае веры ў рэальнасьць незалежніцкага ідэалу закончыў прамоўца сваё выступленьне, заклікаючы беларусаў у сэрцах сваіх будаваць Беларусь, пакуль не прабʼе часіна зьдзейсьненьня агульна-беларускае нацыянальнае ідэі.

Пасьля прамовы грам. Луцкевіча дэклямавалі вельмі ўдала вершы свае, пасьвячоныя сьвяткаваньню, маладыя беларускія паэты Хв. Ільяшэвіч і Аўген Бэртуль. Урачыстасьць была закончана спэктаклем: моладзь беларуская адыграла адноактоўку Янкі Купалы „На папасе“, сымболічны зьмест якое вельмі добра адпавядаў урачыстасьці.

Характэрна адзначыць, што абход сьвята незалежнасьці ў той-жа дзень і ў тую-ж гадзіну ладзілі ў Вільні асобна беларускія хадэкі з неадлучным паслом Ярэмічам. Хадэцкая акадэмія сабрала толькі маленькую жменьку беларусаў, а такжа тых, хто ад іх — па сходнай цане! — купляе беларускую зямлю..

Паводле газэтных вестак, у Савецкай Беларусі былі спробы ладзіць конспірацыйныя абходы ўгодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі. У сувязі з гэтым Г. П. У. зрабіла шмат вобыскаў і арыштаў сярод беларускіх дзеячоў, якія яшчэ аставаліся на волі.

ад імя Гэндэрсона папрасіў, каб той — „не рабіў ніякіх рашучых крокаў у справе, пакуль яна ня будзе абгаворана на маёвай сэсіі рады Лігі Нацыяў“.

І вось нямецкі прэм'ер Брунінг адказаў паслу Англіі так, як дагэтуль — ад канца вайны — нямецкія міністры ня гутарылі яшчэ з урадамі вялікіх дзяржаваў!.. Ён заявіў, што нямецка-аўстрыяцкая ўмова вытрымана сьцісла ў рамках Жэнэўскай конвэнцыі, дык не датыкае зусім поўні дзяржаўнай незалежнасьці Аўстрыі. А таму—як Нямеччына, таксама і Аўстрыя (нямецкі прэм'ер ужо кажа ад імя Аўстрыі!!!) лічыць, што Лізе Нацыяў няма ніякага дзела да гэтай умовы!.. Калі ўрады іншых дзяржаваў маюць якія сумлівы ў праўных падставах умовы, урады Нямеччыны і Аўстрыі (ізноў кажа за Аўстрыю!) ня маюць нічога проці таго, каб высьветліць ім праўную сілу ўмовы. Але дапусьціць, каб Ліга Нацыяў мела разглядаць умовы з пункту гледжаньня палітычнага, нямецкі ўрад ня можа! Бо-ж... умова мае выключна гаспадарчы характар, які датычыць толькі падпісаўшых умову дзяржаў..

Нямецкі прэм'ер дадаў, што затрымліваць працы над правядзеньнем умовы ў жыцьцё да маёвай сэсіі Рады Лігі, як просіць ангельскі міністар, нямецкі ўрад ня можа. Але-ж працы гэтыя й без таго працягнуцца даўжэйшы час—месяцы са тры. Дык дзяржавы маюць досыць часу, каб пазнаёміцца добра з справай...

Цікаўна, што ў Маскве новай умовай страшэнна здаволены. Маскоўская прэса піша, што новая ўмова бʼе сільна ў самыя падставы агіднага Вэрсальскага трактату, дый у Брыянаву „Пан-Эўропу“, якую Масква лічыць арганізаванай выключна дзеля барацьбы з СССР.

Маскоўская прэса, праўду кажучы, толькі псуе немцам іх спрытную йгру, высьвятляючы палітычнае значэньне ўмовы. Яна ўспамінае, што якраз з мытнай уніі пачалося абʼяднаньне Нямеччыны, кажа, што новая мытная ўнія фактычна робіць Нямеччыну ўжо гаспадарчым, пакульшто, суседам Італіі, Югаславіі і Вэнгрыі; робіць з яе найбольш цэнтральную дзяржаву Эўропы, участцы,—стваражчы з яе важны чыньнік балканскай палітыкі. Усё гэта дасьць Нямеччыне першы голас і рашучы ўплыў якраз на той „Пан Эўрапэйскай Канфэрэнцыі“, у тэй „Пан Эўропе“, якую так спрытна парадзіў і падрыхтаваў... для сябе і сваей Францыі—Брыян... Дык дзіва, што Брыян якраз і кусае свае локці са злосьці...

Кароткія навіны.

— Мусаліні надрукаваў у нямецкай прэсе статьцю, у якой кажа, што „мір у Эўропе забясьпечаны... да 1936 г.“ Далей ён кажа, што паразуменьне Італіі з Францыяй ня толькі спыніла адну з прычынаў выбуху новай вайны, але і зьвольніла для Італіі паўтара міліярда ліраў, якія мелі быць ужыты на будову новых браняносцаў. Гэтыя вялізарныя грошы Італія ўжыве цяпер больш карысна—на розныя сацыяльныя мэты, асабліва-ж — на палепшаньне быту работнікаў і працоўнай інтэлігэнцыі, якім у дзяржаве жывецца найцяжэй. У канцы Мусоліні кажа, што паразуменьне з Францыяй паказвае, што ў галовах і сэрцах кіраўнікоў Эўропы яшчэ ёсьць розум Божы. Гэтым камплімэнтам Брыяну і... сабе самому, правадыр італьянскага фашызму канчае статьцю.

Ці—ня добры прыклад для маскоўскіх ком.-фашыстаў?!

— Колькасьць безработных у Італіі пад канец лютага дайшла да 765.325 чалавек, з якіх 200.000 атрымоўваюць запамогу ад дзяржаўнага скарбу.

— У Нямеччыне высока падняў галаву нацыяналістычны й рэакцыйны саюз былых вайскоўных, так званы „Сталёвы Шалом“ („Штальгэльм“). На вялізарным мітынгу яго правадыры заявілі, што „саюз—гатовы да барацьбы“. Мітынг скончыўся вялікім боям з паліцыяй, якая змушана была пусьціць у ход „рэзіну“, а нават і карабіны.

Няменш актыўна выступаюць „нацыянал-сацыялісты“ — „гітлераўцы“. У Кэнігсбэргу — на провадах сваіх правадыроў Гэбэльса і прынца Аўгуста (сына былога кайзера), гітлераўцы таксама распачалі бой з паліцыяй, якая аднак-жа жорстка расправілася з імі, сільна пабіўшы рэзінавымі палкамі абодвух правадыроў, ня выключаючы і былога прынца!..

— Амаль па ўсей Нямеччыне што-дня можна заўважыць крывавыя бойкі паміж народнымі сацыялістамі і камуністамі.

У гэтых днях Бэрлін быў ізноў сьведкаю такіх крывавых боек, падчас якіх шмат камуністаў было паранена.

— Новы — ужо шосты — транспарт радавага золата ў 100 скрыняў пайшоў з Масквы ў Бэрлін. Усё гэтае золата йдзе ў забясьпечаньне радавых замоваў на нямецкія тавары, сягаючыя, быццам, міліярда марак. Нямецкі ўрад гарантуе фабрыкантам іх рызыку гандлю з Радамі толькі на 40%. Гэтыя замовы — рэзультат апошняй візыты кампаніі найбуйнейшых прамыслоўцаў Нямеччыны ў СССР, дзе гэтых „каралёў буржуазіі“ маскоўскі „пралетарскі ўрад“ прыймаў ды частаваў, залiваючы шампанскім так, як хіба-ж не рабіў гэтага нават царскі ўрад, бо... менш быў залежны ад іх ласкі і ратунку.

— Нямецкі парлямэнт прыняў ваенны бюджэт. Паміж іншым прыняты былі й крэдыты на два браняносцы. Каб не перашкодзіць апошнім, сацыял дэмакраты ўстрымаліся ад галасаваньня. Цікаўна, што мін. Грэнэр, супакойваючы французскую апінію, востра абураўшуюся проці разбудовы нямецкага флёту, тлумачыў, што Нямеччына будуе браняносцы зусім ня проці Францыі, але з увагі на магчымасьць нападу... з боку Польшчы.

— Грэцка-каталіцкі (вуніяцкі) мітрапаліт Шэптыцкі паважна захварэў на запаленьне лёгкіх. Дактары лічаць палажэньне хворага сур'ёзным.

— Пасьля візыты нямецкіх прамыслоўцаў у СССР, надумаліся ехаць туды-ж таксама за міліённымі замовамі і польскія прамыслоўцы на чале з ведамым правадыром буйнай буржуазіі Вежбіцкім. Асабліва вялізарныя надзеі маюць прамыслоўцы мэталёвыя, фабрыканты сельска-гаспадарчых машынаў, паравозаў і г. д.

— У Латвіі пасьля кароткага ўрадавага крызісу стварыўся новы габінэт Ульманіса, які падтрымлівае тая самая буржуазная большасьць у парляманьце, што падтрымлівала папярэдні ўрад Цэльміня.

Дэклярацыя новага габінэту кажа, што першай задачай яго будзе ўкрапленьне гаспадарчай сілы і фінансавай раўнавагі краю.

Маленькі фэльетон.

Парлямантарыст.

— Ня маеце паняцьця, як трудна быць палітыкам—жаліўся пасол Юрэвіч сваім сябром пры чорнай каве з каняком.—Усюды будзь, усюды дапільнуй, глядзі, каб на пленуме оказаць прамову добра і ў камісіі сойму працаўніка палажыць на абедзьве лапаткі, і на галасаваньне не спазьніцца. Слухаюць гэта цябе розныя „галілейскія“ дактары, прафэсары, разінуўшыся і дзівам дзівяцца скуль гэтая бярэцца здольнасьць да палітыкі. Аднаго разу...

— Ты мне даруй, — перабіў кумпан, задумчывыя вочы якога яшчэ выражалі даволі цьвярэзасьці—мне, бачыш, часта прыходзіць у галаву дзіўная праблема.

Юрэвіч ня любіў чужаземных слоў. Не дзеля чыстаты мовы, а проста іх не разумеў. І нічога так на сьвеце не баяўся, як таго, каб аб гэтай яго слабасьці мог нехта ведаць. Каб скрыць сваё няведаньне, ён меў прывычку розныя лацінізмы ўжываць сам, добра іх перакруціўшы і найчасьцей неўпапад. А дзеля таго, што цяпер на сьвеце людзей шчырых і сьмелых ня шмат—нашаму парлямантарысту ўсе лацінізмы праходзілі бяскарна, хоць натварылася каля іх дзесяткі жартаў. Цяпер пачуўшы словы „дзіўная праблема“ заместа запытацца: што гэта такое? — Юрэвіч незадумаўшыся сказаў:

— Чаму дзіўная?

— Дзіўная тым—цягнуў запытаны,—што такая штодзенная, простая і трудная да вырашэньня. Бачыш, здаўна хачу мець дакладнае сфармуляваньне слова палітыка. Я шмат чытаў, шукаў па энцыклапэдыях і ні адзін адказ мяне не здаволіў. Можа ты гэта зробіш—парлямантарысту гэта найлягчэй.

Прысутныя пераглянуліся, быццам хацелі разгадаць, ці нязусім п'яны кумпан хоча закпіць з Юрэвіча, ці проста яго ня знае.

Настала цішыня. Ей трэба падзякаваць, што да Юрэвічавых вушэй даляцелі оказаныя паўшэпатам, але выразныя словы:

— Нашоў да каго зьвярнуцца.

Гэтую ўвагу чулі амаль усе і Юрэвіч аб гэтым ведаў. Каб ратаваць сытуацыю ён зрабіў від, што нічога ня сталася і цішыню нарушыў звонам лыжкі, мяшаючы ў шклянцы, хоць туды яшчэ ня клаў цукру.

Сусед справа, галава каторага адмаўлялася заховываць раўнавагу з прычыны выпіўкі, неспадзявана для ўсіх, дабрадушна заўважыў у бок Юрэвіча:

— Ты, родненькі, спазьніўся памяшаць цукер.

Парлямантарысту гэтага было ўжо зашмат. Яго агарнула нябывалая злосьць, але ня мог яе выяўляць. Ламаў галаву над тым, які даць адказ. Столькі гадоў быў паслом сойму, уступаў у дыскусыю амаль-што з усімі міністрамі ў розных пытаньнях, а тут ня мог найсьці слова. Ведаў, што калі ня дасьць добрага адказу, або змоўкне, высьмяюць за вочы, а гэтага ён найбольш баяўся. Яму зрабілася горача ад гвалтоўнага прыплыву розных думак і запанавала цішыня.

— Палітыка, гэта тое самае, што ашуканства—прабаваў пасла выручаць кум Вашэйла.

— Яно так,—патаківалі іншыя—але ня зусім.

Твар Юрэвіча ў гэтым мамэнце нейк нязначна прасьвятлеў. Нашоў выхад.

— Даруйце родненькія, што не магу з вамі больш забаўляцца, чуюся вельмі дрэнна, здаецца крышку мерку перабраў. Прашу кума Вашэйлу завясьці мяне да аўта — дакончыў самлелым голасам пасол.

— Кэльнэр, рахунак—загрымела кумпанія.

Праз паўгадзіны Юрэвіч качаўся, як у белым яблоку, у сваёй коўдры. Галава трашчэла ад дзьвух прычын: ад каняку і назойлівага пытаньня: „што такое палітыка“?

Што палітыка аснавана на ашуканстве, аб гэтым Юрэвіч ведаў вельмі даўно. Але, як-жа будучы палітыкам да гэтага прызнавацца? „Гэта-ж было-б не палітычна“—замармытаў голасна.

— Спі спакойна, калі перабраў,—адазвалася жонка і падышоўшы нацягнула яму коўдру аж пад бараду.

Але Юрэвіч ня мог успакоіцца. Як камянём залягла ў мазгах думка, як адказаць на пытаньне. Знямагаў пад яе цяжарам, чуў сваю слабасьць як ніколі.

Стараўся заснуць. Дарма. Слухаў ціканьне

гадзіньніка. Як на злосьць Юрэвічу, ягоны ўласны гадзіньнік выступаў проціў свайго гаспадара: зяместа штодзеннага „цік так“, пасол з абурэньнем бязьмерным сьцьвярдзіў, што ён зусім выразна выстуківае: „па-лі-ты-ка, па-лі-ты-ка“...

Пасол меў ахвоту хапіць і шыырнуць гадзіньнікам у сьцяну, але падумаў і сам пастыдаўся сваёй думкі. Пачаў лічыць колькі разоў ён выбразгае „па-лі-ты-ка“. Калі далічыў да двух сотак, яго агарнула соннасьць. Бразг гадзіньніка пераменіўся нязначна ў глухі і роўны стук калёсаў вагону першай клясы.

Юрэвіч ехаў на паседжаньне сойму.

У сталіцы было-б усё пастарому, каб не адна няпрыемная навіна. За часоў адсутнасьці Юрэвіча, сойм правёў нячуваную ў сьвеце ўставу: кожны пасол павінен быў здаць эгзамен з паліт-граматы перад адумысловай камісіяй. Вымагалася ведаць элемэнтарны курс з гісторыі, геаграфіі, умець лічыць да 1300 (столькі выплачываецца паслу месячных дыетаў) і распісацца без памылак. Няздаўшым эгзамену пагражала пазбаўленьне дыетаў у працягу паўгоду, гэта знача да склікань-я новай камісіі.

— Толькі гэтага не хапала—загрымеў Юрэвіч моцнымі славамі яшчэ з пецярбурскіх часоў і неадкладна зьявіўся ў камісіі з надзеяй, што яму лёгка пойдзе.

Эгзамены былі кароткія:

Юрэвіч баяўся толькі аднаго: каб не запыталі, што такое палітыка?

— Скажыце нам, пане пасол Юрэвіч,—пачаў географ, дзе знаходзіцца Міссісіпі?

— Як? Місіпісі? Гм, місі-пісі—працягла паўтарыў пасол і раптам расхахатаўся.—Але-ж і жартаўнік пан—дадаў.

Эгзаменатары пераглянуліся, некаторыя толькі заварушылі плячамі. Географ пытаў далей:

— Можа нам пан назаве сталіцу Злучаных Штатаў?

— Нюёрк.

— Гм, а ці вам, пане пасол, няведама, часам, імя мэксыканскага караля? — зажартаваў іншы эгзамінатар.

— Забыўся, паночку. Ужо шмат часу, як хадзіў у школу. А ўрэшце, што-ж гэта вы так намагаеце на Амэрыку? Мяне-ж там у паслы ня выбіралі. Гэта-ж далёка. За морам, кажуць. Во, каб мяне паны запыталі, як у нас называецца цыганскі кароль — гэта справа іншая, справа свая, рэгіянальная. А вы тут мне нейкую заморскую мэтаморфозу разводзіце.

— Просім, калі так, расказаць нам пра Швайцарыю і яе палітычны лад — заявіў эгзаменатар.

— Швайцарскі лад — добры лад — з ажыўленьнем сказаў Юрэвіч.—Я там нават быў. Адно дрэнна, што ня мог з Швайцарамі па іхняму размаўляцца, панашаму не разумеюць, а ўсё пашвайцарску гаргечуць. Імя іхняга караля ня помню, але сталіца называецца Жынева. Прыгожае места і пабавіцца можна, абы толькі былі грошы. Дзяўчаты ў іх цікавыя. Выглядаюць добра, бо, як я чуў, кормяцца швайцарскім сырам. Яго там многа фабрыкуюць і ядуць. У возеры жынейскім ёсьць і рыба. А як-жа? Акуні зусім такія самыя, як у нас.

— Даволі,—заявіў географ.

Цяпер пытаўся гісторык:

— Што вы ведаеце аб люблінскай Уніі?

— Даруйце, гэта не на маёй памяці дзеялася.

— Якіх Вы ведаеце найвялікшых мужоў Вялікага Княства Літоўскага.

— Лёнгінус Подбіпента.

— У якой мове пісаўся літоўскі статут?

— Калі літоўскі, то ясна, што палітоўску, Вы паночкі такіх сьмешных пытаньняў не давайце. Выглядае гэта ўжо на зьдзек.

Камісія нешта пачала між сабою шаптацца, пасьля чаго старшыня заявіў:

— Даволі, пане пасол, заўтра на арытмэтыку і навуку пісаньня можаце не прыхадзіць.

Юрэвіч зразумеў, што дыетаў яму да восені не атрымаць. Прабаваў яшчэ нешта гаварыць, але прэзэс камісіі прыціснуў нейкі гузічак і наш пасол з вялікім страхам заўважыў, як вялікі паркетны квадрат, дзе ён стаяў, пачаў аддзяляцца і апускацца ўніз, пад зямлю разам з парляментарыстам. Страпянуўся пасол у жуткай цемры і прачнуўся на падлозе ля самага ложка ў сваёй хаце. Працёр заспаныя вочы, выцер з лба пот, узгробся назад на ложка і прастагнаў да прыбегшай на помач жонкі:

— Цяжка быць палітыкам на Беларусі.

Белы

Бязсільная злосьць Беларускай Хадэцыі.

„Беларуская Крыніца“—орган вядомага ўсім кс. А. Станкевіча апошнімі часамі аж пеніцца ад бязсільнае злосьці. Пеніцца таму, што бачыць як бязупынна ўся іх і датаго невялічкая „кумпанія“ пачынае развальвацца. „Беларуская Крыніца“ сталася цяпер — брукавай шкумацінай. Кожны нумар гэтае шкумаціны запаўняецца выключна плёткамі, якія творацца на шляху: ад Людвісарскай да Мікалая, ад Мікалая да Полацкай — галоўнага штабу гэтае „кумпаніі“. Перш вялі атаку на Віл. Беларускую Гімназію, цяпер пашырылі сваю „сфэру дзеяльнасьці“ на Беларускі Студэнскі Саюз, ну і зразумела-ж на Цэнтрасаюз. Хацелі пасварыць студэнтаў беларусаў з студэнтамі ўкраінцамі, але не ўдалося, а Ярэма ўжо паціраў рукі, што з сваімі 4 студэнтамі хадэкамі (бо на ўвесь Бел. студ. саюз яны толькі і маюць 4 х студэнтаў), якія змушаны круціцца каля гэтае „кумпаніі“, каб зарабіць крыху сабе на хлеб, ды 1—2 скооптованымі ўкраінцамі, заложыць і ў Вільні Белар.-Украінскі Саюз на манер таго, як ён Ярэма зрабіў гэта ў Варшаве за што і мандацік атрымаў.

Кіньце, паночкі, на Вас ужо ўсе пазналіся і ніхто Вашае бруднае работы памагаць Вам рабіць ня будзе — варэцеся самі ў сваім брудным собскім соку, а ад чыстае моладзі прэч! Прэч свае брудныя рукі! Замест высокае палітыкі лепш „высокопаважаны“ Адаме зьвярні ўвагу на тую клёаку, якую завёў на Полацкай. Пачысьць інтэрнат, каб стогаловыя вошы па вучнях не хадзілі, а то як аказалася ня толькі атручваеш душу беднае незаможнае моладзі, але і цела яе ў поўным гэтага значэньні слова. Ці-ж бы рука тых, каму даручана гэтая моладзь у школе не дасягнула гэтае вашае клёакі? Ня верыцца. Тут ужо слова за Дырэктарам.

Блізкі.

Хроніка.

— **Арышт на новую кнігу.** Вышла з друку новая кніжка Брачыслава Скарыніча „Нашто й як зьбіраці геаграфічныя й асабовыя назовы беларускія“, але была сканфіскавана праз уладу. Кніжка выдадзена ў Вільні Беларускім Студэнцкім Саюзам.

— **Матуральныя экзамены ў Віленскай Белар Гімназіі.** Як чуваць матуральныя эгзамены ў гэтым годзе пачнуцца ў першай палове траўня.

Усіх вучняў 8 клясы лічыцца 30 чалавек. Перад сьвятамі адбудзецца паседжаньне Педагагічнае Рады, на якім будзе разгледжана справа дапушчэньня да гэтых экзаменаў вучняў. Пажадаем пасьпехаў нашай моладзі, якая павінна павялічыць кадры нашай інтэлігенцыі.

— **Пахароны вучня Белар. Гімназіі Сакалова.** У нядзелю, 22 сакавіка адбыліся ўрачыстыя пахароны вучня 5 кл. Сакалова.

Цела нябошчыка праводзілі ўсе вучні гімназіі, педагагічная рада і шмат беларускіх грамадзян. Жалобны марш граў вучнёўскі аркестр.

Сакалоў памёр ад сухотаў, якія хутка падтачылі малады арганізм і прадчасна зьвялі яго ў магілу.

Запярэчаньне.

(*Пісьмо ў Рэдакцыю*).

„Беларуская Крыніца“ ў № 10 з 13 сакавіка надрукавала заметку, у якой заяўляе, быццам, „як даведываецца“ Рэдакцыя гэтае часопісі, брашура гр. Акінчыца пад назовам „Чаму гэта так сталася?“ перад яе выхадам у сьвет „была сьпярша прадметам разважаньня яе зьместу на адным з паседжаньняў „Цэнтрасаюзу“ ў поўным складзе зацікаўленых асоб: А. Луцкевіча, Астроўскага, Акінчыца і кумпаніі“.

Ад імя Прэзыдыюму „Цэнтрасаюзу“ заяўляем, што заметка гэтая цалком разыходзіцца з праўдай. „Цэнтрасаюз“, як установа непалітычная, ніякага ні беспасярэдняга, ні пасярэдняга ўчасьця ў выступленьні былога сэкрэтара свайго, гр. Акінчыца, ня браў, брашуры яго да паяўленьня яе ў друку не разглядаў і „апрабаты“ свае на яе не даваў. Брашура гэтая цалком ляжыць на сумленьні яе аўтара, і перакіданьне органам кс. Станкевіча адказнасьці за яе на беларускае грамадзянства, аб'яднанае ў „Цэнтрасаюзе“, зьяўляецца нясумленным і няпрыстойным паступкам.

Старшыня: **Ан. Трэпка.**

Сэкрэтар: **Я. Шнаркевіч.**

Вільня, 26. III 1931.

Бібліяграфія.

V. Rozumowič-Chmara „Grimassy svetové války (Грымасы сусьветнай вайны). Nakladatelstvi Všetečka a spol. v Praze 1930. Старонак 238. Цана 28 крон чэскіх.

Пад гэтым загалоўкам выйшлі ў Празе, у чэскай мове, успаміны вядомага атамана-партызана Хмары-Разумовіча. Успаміны гэтыя заслугоўваюць на ўвагу перадусім беларускага грамадзянства, асабліва палітычных дзеячоў, бо аўтар адхіляе заслону партызанскага руху на Беларусі ў першыя гады пасьля Рыскага міру, а разам з гэтым апісвае закулісную працу ня толькі розных беларускіх дзеячоў з ураду Белар. Народнай Рэспублікі, але й цэлага шэрагу сусьветных палітыкаў ад Версальскага міру да 1930 га году. Аўтар у сваіх успамінах паслугоўваецца фактычных матэрыялам, дакумэнтамі і прозьвішчамі, якія лёгка можна праверыць, хоць не заўсёды пагадзіцца з яго вывадамі. Напісаць кароткі зьмест гэтых „успамінаў“, вельмі разнаякіх па зьместу, часта вельмі красачных у апісаньні і нават, разам з гэтым, худных у дэталях—вельмі трудна. Перагортваючы хутка першыя старонкі аўтабіяграфіі Хмары-Разумовіча з першых гадоў сусьветнае вайны і соцыяльнае рэволюцыі на Украіне, затрымоўваецца мімаволі ўвага на дзейнасьці ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі, эвакуяванага ў Коўню, Літоўска-Беларускіх адносінах, і Радзе Беларускіх Стральцоў. Потым ідзе праца і роля беларускіх партызанаў у Літве, Польшчы і БССР. Многа вельмі нямачнае для Ліцьвіноў і Палякоў падае Хмара праўды аб выкарыстываньні слабасьці беларускага палітычнага руху і зішчэньні фізычна беларускага народу. Спэкуляцыі, афэры, шпікоўства, правакацыі — ўсё гэта вельмі добра адбіта ў успамінах Хмары і дасьць магчымасьць многім з чужынцаў разабрацца ў беларускай гісторыі нядаўна мінулых гадоў. Няведама толькі адно, як аднясуцца да гэтых успамінаў зачэпляныя неміласэрна асобы, якія яшчэ жывуць і нават занімаюць вельмі адказныя становішчы. Трэба думаць, што рэагаваць яны будуць.

Дзеля таго, што Хмара абраў сабе спосаб пісаньня „ўспамінаў“ асоба аўтара высоўваецца на першае мейсца і дзеля гэтага варта на гэтым затрымацца. З усей кніжкі (гэта толькі першая частка!) пазьбіраны характэрныя рысы датычучыяся асобы аўтара ў агульнай суме не даюць ўсё-ж дадатняга ўражаньня. Аўтар, праўда, не адракаецца свайёй нацыянальнасьці, нават некалькі разоў надкрэсьлівае выразна сваю беларускасьць, але робіць гэта па стольку па скольку. Часта ў палітычных опэрацыях і спэкуляцыях гандлёвых—паказвае сябе вельмі з дрэннага боку. Прыблутаў свае дзіця і жонку да гэтых успамінаў зусім непатрэбна. Для большае сэнсацыйнасьці сваіх успамінаў, Хмара дадае ў канцы свае адносіны да гэнэрала Кутепава і сустрэчы з ім у Парыжы, ды шмат іншых падобных момэнтаў. Нагул аўтар шырака размахнуўся ў сваіх ўспамінах. Падаў матэрыялу шмат, але мэты не дапяў. Аднак для кожнага беларускага, літоўскага, польскага і расейскага палітыка—ў першае меры гэтая кніжка неабходна для ўразуменьня сутнасьці справы, палітычных адносінаў у нашым краі. Дзеля гэтага прачытаць гэтую кніжку варта, тым балей, што чэская мова даволі прыступная, а да таго быццам мае быць зроблены пераклад яе на нямецкую мову.

Зміч.

Розныя весткі з нашага краю.

Вялікі пажар у м. Мікашэвічы.

23 сакавіка ўспыхнуў вялікі пажар у м. Мікашэвічы, у выніку якога згарэла шмат дамоў і два скураных заводы. Убыткі аграмадныя. Ёсьць падставы думаць, што прычынаю пажару зьяўляецца падпал.

Арышт адваката, прысвоіўшага 105.000 зл.

У Лазовічах быў арыштаваны па загаду берасьцейскай паліцыі адвакат Павількоўскі, які абвінавачваецца ў прысвоеньні 105.000 зл. кліенцкіх грошаў.

З жыцьця Савецкай Беларусі.

Арышты беларусаў ня спыняюцца.

У Полацку і Бабруйску зноў камуністычныя ўлады арыштавалі шмат беларусаў, абвінавачваючы іх у г. зв. нацыянал-дэмакратызьме.

На чале арыштаваных знаходзіцца вучыцель з Полацку Віталініч Міхась. Усе арыштаваныя вывязены ў Смаленск, а памешканьні іх засталіся апечатанымі ГПУ.

Радактр-выдавец: **М. Сіняўскі**

Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.